## *Валянціна Варапаева*

***

Семдзесят год…Гэта многа ці мала?
Столькі з той страшнай вайны мінавала.
Можа, забыць ўсё?
Каб сэрца не рвала,
Душа не пакутавала і не стагнала!
Полк бессмяротны
Ідзе па планеце,
У неба сягае –
на-па-мі-на-е!!!
Людцы, глядзіце: усе мы
жывыя,
Вочы не выцвілі:
мы – маладыя!
Мы аддалі вам планету зямную:
мірную, любую, дарагую.
Беражыце яе!
Полк бессмяротны
Ідзе па планеце,
У неба сягае –
на-па-мі-на-е:
Душы ратуйце!
Пільнымі будзьце!
Нас не за-будзь-це!

***

Апошні дзень лета –
Закрытая кніга.
Апошні дзень лета,
А песня не спета…
Гучаць яшчэ ў сэрцы
Мелодыі лета,
мелодыі лета,
мелодыі лета…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І дрэвы стаяць у зялёным уборы,
І зоркі мільгаюць у светлай прасторы,
А восені подых прыходзіць начамі
З туманамі белымі,
З грыбнымі дажджамі.

Апошні дзень лета –
Закрытая кніга.
Старонкі сагрэтыя
Сонцам і светам,
Любоўю і спадзяваннем
На новае лета.

***

У шыбу галінкаю белаю стукае снежань,
Маркотна ківае сівой галавой.
І думы самотныя чародкаю коцяцца,
Трывожаць, бунтуюць, зносяць спакой.

Заснежыцца хутка.
Наступяць марозы.
І сціхне гармоніка гук за ракой.
І толькі ўспаміны пра цёплае лета
Суцешаць, сагрэюць халоднай зімой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ